УДК 340.113:81

# МНОГАКАМПАНЕНТНЫЯ ТЭРМІНЫ КАНСТЫТУЦЫЙНА-ПРАВАВОЙ ЛЕКСІКІ

***А. У. Касцюкова***
*курсант 1 курса факультэта міліцыі*
*Магілёўскага інстытута МУС Рэспублікі Беларусь*
*Навуковы кіраўнік:* ***А. М. Шубадзёрава****,*
*дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС Рэспублікі Беларусь,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

Праблема сістэматызацыі і ўдасканалення паняційна-тэрміналагічнай сістэмы актуальная для любой галіны навукі і практыкі, у тым ліку і юрыдычнай. Канстытуцыйнае права з’яўляецца адной з тых навукова-практычных абласцей, якія маюць ў сваім арсенале самую шырокую і разнастайную тэрміналогію.

Адно з галоўных патрабаванняў, што прад’яўляюцца да тэрмінаў і тэрміналагічных канструкцый, — дакладнае слоўнае адлюстраванне абазначаных імі рэалій. Асаблівае значэнне мае дакладнасць тэрмінаў у нарматыўным рэгуляванні, перш за ўсё ў прававым, якое распаўсюджваецца на шырокае кола людзей, іх аб’яднанняў, арганізацый.

Матэрыялам нашага даследавання з’яўляюцца многакампанентныя тэрміны канстытуцыйна-прававой лексікі, выбраныя са Слоўніка юрыдычных тэрмінаў [1]. Аналіз адабранага фактычнага матэрыялу паказаў, што найбольш часта сустракаюцца двух- і трохкампанентныя тэрміны, значна радзей ужываюцца чатырох-і пяцікампанентныя.

Сярод двухкампанентных можна вылучыць два найбольш ужывальныя структурныя тыпы тэрмінаў, у склад якіх уваходзяць: 1) назоўнік і прыметнік (*канстытуцыйнае права, выбарчая сістэма, заканадаўчы працэс, палітычная сістэма, прававая сістэма* і інш.), 2) спалучэнне назоўнікаў (*правы чалавека, Міністэрства юстыцыі, свабода слова, склад урада, асобы без грамадзянства* і інш.)

Трохкампанентныя тэрміны пераважна складаюцца: 1) з прыметніка і двух назоўнікаў (*крыніцы канстытуцыйнага права, удзельнікі грамадзянскага працэсу, грамадзянскія правы і абавязкі*); 2) з назоўніка і двух прыметнікаў (*усеагульнае выбарчае права, нарматыўны прававы акт, пасіўнае выбарчае права*).

Тэрміны, у склад якіх уваходзяць чатыры і болей кампанентаў, ужываюцца значна радзей (*набыццё прыгаворам законнай сілы; канстытуцыйныя правы, свабоды і абавязкі грамадзян*).

Такім чынам, тэрміналогія канстытуцыйна-прававой лексікі разнастайная не толькі па змесце, але і па структуры.

---

1. Венідзіктаў С. В., Даніленка С. І. Беларуская мова. Юрыдычная лексіка : вучэб. дапам. Мінск : Выш. шк., 2019. С. 111–135. Вернуться к статье